УДК 9 (476)

# Некаторыя аспекты ўзаемаадносін Беларусі і Літвы на пачптку XX стагоддзя

Багдановіч А.Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

На рубяжы XIX-XX стагоддзяў назіраецца значнае ажыўленне як беларускага, так і літоўскага нацыянальных рухаў. Абодва народы, прыгнечаныя ў межах Расійскай імперыі, імкнуцца вызначыць свае адносіны да перспектыў развіцця ўласнай дзяржаўнасці, знайсці дзейсныя формы арганізацыі для абароны сваіх інтарэсаў.

У 1904-1905 гг. пытанне аб самакіраванні Паўночна-Заходняга краю актыўна абмяркоўвалася ў гуртках аўтанамістаў. У гэтыя гурткі ўваходзілі і беларусы, і літоўцы, і палякі, і яўрэі. Асноўнай задачай гурткоў была прапаганда ідэі "аўтаноміі Літвы і Беларусі на дэмакратычных пачатках з гарантыяй раўнапраўя і свабоднага развіцця ўсіх нацыянальных меншасцяў у межах краю". Галоўная спрэчка ў гуртках аўтанамістаў разгарэлася па пытанню аб тым, ці варта лічыць Літву і Беларусь агульнымпалітычным цэлым, грунтуючыся на гістарычнай агульнасці і на эканамічных і культурных сувязях, ці прызнаць поўную дваякасць, кладучы ў аснову этнагрфічны крэтэрый.

Ідэю палітычна аўтаномнай агульнасці Літвы і Беларусі абаранялі палякі, беларусы і яўрэі. Пры гэтым палякі і яўрэі зыходзілі з таго, што польскі і яўрэйскі народы ў Літве і Беларусі складаюць адзінае цэлае. Беларусы ж асноўваліся на гістарычным адзінстве абедзьвух зямель, іх эканамічных і культурных сувязях. Акрамя таго, беларускі рух быў яшчэ зусім маладым, нешматлікім і слабым, таму дабіцца аўтаноміі ўласнымі намаганнямі ўяўлялася ім надзвычай складаным. Для літоўцаў жа агульнасць Літвы і Беларусі здавалася непажаданай, так як у рамках гэтага адзінага нацыянальна-дзяржаўнага ўтварэння яны аказаліся б у становішчы нацыянальнай меншасці. Акрамя таго, аўтаномная Літва, па іх меркаванню, павінна была ахапіць, акрамя ўласна Літвы, значную частку Заходняй Беларусі.З такім тэрытарыяльным падзелам не маглі пагадзіцца беларусы-аўтанамісты.

Увосень 1915 г. заходнюю частку Беларусі (Гродзенскую, большыя часткі Віленскай і Мінскай губерняў акупіравалі германскія войскі. Беларускія нацыянальныя дзеячы, якія засталіся на гэтай тэрыторыі, вымушаны былі прыстасавацца да новых умоў дзейнасці і выкарыстаць іх для нацыянальдзяржаўнай справы. Яны паставілі перад сабой мэту аднавіць незалежнае ВКЛ, дакладней, незалежнасць Літвы і Беларусі, якія ахоплівалі літоўскія і беларускія землі, аб'яднаныя эканамічнымі інтарэсамі і агульнымі палітычнымі жаданнямі.

У снежні 1915 г. быў праведзены шэраг беларуска0літоўскіх нарад. У іх таксама прымалі ўдзел некаторыя яўрэйскія і польскія дзеячы. Была выпрацавана асноўная пазіцыя, зыходзячы з якой планавалася ставіць пытанне аб будучыні беларуска-літоўскіх зямель, занятых немцамі. У выніку па ініцыятыве беларусаў была дасягнута дамоўленасць з польскім, літоўскім і яўрэйскім камітэтамі аб утварэнні Канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага. Гэтая згода была аформлена Універсалам, выдадзеным на чатырох мовах (беларускай, яўрэйскай, польскай і літоўскай) Часовай радай Канфедэрацыі 19 снежня 1915. там былі выкладзены асноўныя прынцыпы праекта.

Ва Універсале адзначалася, што канфедэрацыя ствараецца на аснове незалежнасці Літвы і беларусі як супольнай дзяржавы, дзе ўсім нацыям будуць забяспечаны роўныя правы.

Як дапаўненне да Універсала той жа Радай у лютым 1916 г. была выдадзена адозва-заклік "Грамадзяне!", у якой больш падрабязна выкладаліся асноўныя пачаткі палітычнага ладу будучай Канфедэрацыі.

У адпаведнасці з гэтым дакументам канфедэраты планавалі зрабіці:

"1) Беларуска-літоўскія землі незалежнай дзяржашнай адзінкай з соймама у вільні, выбраным на аснове агульных, роўных, прамых і тайных выбараў, з забеспячэннем поўных правоў усім нацыянальнасцям, якія жылі на гэтых землях.

2) У склад новай беларуска-літоўскай дзяржавы павінны былі ўвайсці землі, занятыя нямецкімі войскамі: Віленская і Ковенская губерні, беларуская і літоўская часці Гродзенскай і Сувалкаўскай губерні, Курляндскай губерні і часці Мінскай, якія звязаны з Віленскім цэнтрам.

3) Формы ўнутранага ладу і асноўная канстытуцыя павінны быць устаноўлены і зацверджаны Устаноўчым соймам у Вільні, выбраным агульным, прамым і тайным галасаваннем."

Запланаваная канфедэрацыя адпавядала праектаванай схеме "Сярэдняй Еўропы", прыхільнікам якой быў дзяржаўны надсакратар Германіі А.Цымерман.

Важную ролю ў пашырэнні ідэі канфедэрацыі адыграў Беларускі Народны Камітэт (БНК), прадстаўнікі якога на чале з А.Луцкевічам прымалі ўдзел у III Кангрэсе Нацый, што праходзіў 27-29 чэрвеня 1916 г. у Лазане (Швейцарыя). Галоўныя патрабаванні беларускага руху былі састаўлены на аснове рэферата, распрацаванага А.Луцкевічам – "Злучаныя Штаты ад прыбалтыкі да Чорнага мора". Гэта быў план шырокай канфедэрацыі у складзе Беларусі, Літвы, Латвіі і Украіны. Такім чынам, на змену ідэі аб незалежнай дзяржаве з аўтаномнымі тэрыторыямі прыйшла ідэя канфедэрацыі незалежных дзяржаў, моцнага іх эканамічнага і палітычнага блоку.

Не знайшоўшы падтрымкі ўрадаў краін Еўропы, беларускія дзеячы сталі наладжваць новыя перагаворы з Літоўскім Камітэтам з "мэтай высветліць асновы сумеснага дзяржаўнага жыцця Беларусі і Літвы". Аднак на пататку 1917 г. літоўцы адмовіліся ад далейшых перамоў і па рэкамендацыі Германіі канчаткова парвалі сувязі не толькі з беларускім, але і з польскім і літоўскім нацыянальнымі цэнтрамі.Яны клапаціліся аб стварэнні сваёй уласнай дзяржавы. Літоўскія дзеячы мелі сустрэчу з канцлерам Германіі і прапанавалі яму канкрэтны план будаўніцтва Літвы ў такіх межах, каб літоўцы мелі ў ёй колькасны перавес. Сталіцай павінна была стаць Вільня.

З дапамогай нямецкай улады ў Вільні 18-22 верасня 1917 г. адбылася канфедэрацыя "прадстаўнікоў нацыі" і была створана дзяржаўная рада – Тарыба – як вярхоўны орган Літвы. Тарыба абвясціла сябе "дзяржаўным цэнтрам Літвы, і беларусы нямецкай акупацыі ўваходзяць у яе склад у якасці прадстаўнікоў падначаленай народнасці". Такім чынам, ня гледзячы на распрацаваны праект, адраджэння "гістарычнай Літвы" ў форме Канфедэрацыі ВКЛ не адбылося.